ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
18.07.2023 № 198

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Музыка» для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

## ГЛАВА 1 АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Музыка» (далей – вучэбная праграма) прызначана для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 138 гадзін (1 гадзіна ў тыдзень) у I–IV класах. Працэс засваення зместу вучэбнага прадмета «Музыка» падзелены на этапы, якія адпавядаюць гадам навучання. Колькасць вучэбных гадзін, адведзеная на вывучэнне тэм у рамках чвэрцяў і паўгоддзяў, з’яўляецца прыкладнай. Педагагічны работнік мае права пераразмяркоўваць колькасць гадзін на вывучэнне тэм у межах агульнай колькасці гадзін, адведзеных на вывучэнне тэмы чвэрці ці паўгоддзя.

3. Мэта навучання вучэбнаму прадмету «Музыка» – фарміраванне музычнай культуры навучэнцаў як часткі іх духоўнай культуры.

Кампаненты мэты:

адукацыйны – засваенне музычнага мастацтва праз авалоданне музычнымі ведамі; слухацкімі, выканальніцкімі і кампазітарскімі ўменнямі; засваенне мастацкага спосабу пазнання свету;

выхаваўчы – выхаванне любові да музыкі, мастацтва; прысваенне чалавекам, які расце, каштоўнасцей, закладзеных у змесце твораў мастацтва;

развіваючы – развіццё музычных, камунікатыўных, творчых здольнасцей; развіццё самастойнасці і ініцыятыўнасці ў вырашэнні творчых задач.

Звышзадачай вучэбнага прадмета «Музыка» з’яўляецца выяўленне цеснай сувязі музыкі і жыцця. Вырашэнне звышзадачы ажыццяўляецца праз вызначэнне жыццёвых вытокаў і жыццёвага зместу музыкі, а таксама прымяненне вопыту музычнай і мастацкай дзейнасці, набытага ў працэсе навучання.

4. Задачы вучэбнага прадмета «Музыка»:

4.1. фарміраванне музычных кампетэнцый: выхаванне любові да музыкі, засваенне музычнага мастацтва (авалоданне музычнымі ведамі, слухацкімі, выканальніцкімі і кампазітарскімі ўменнямі), развіццё музычных здольнасцей. Задача вырашаецца з дапамогай:

фарміравання ўяўленняў пра музыку як самакаштоўны від мастацтва, яе змест і выразную мову;

фарміравання ўменняў слухаць, выконваць, складаць музыку;

развіцця музычных здольнасцей;

назапашвання вопыту ажыццяўлення музычнай дзейнасці;

4.2. фарміраванне мастацкіх кампетэнцый: развіццё мастацкага густу, назапашванне вопыту самастойнай мастацка-творчай дзейнасці. Задача вырашаецца з дапамогай:

фарміравання ўяўленняў пра музыку як неад'емную частку мастацкай культуры, агульнасць зместу розных відаў мастацтва, адрозненні ў выразных мовах;

засваення мастацкага спосабу пазнання свету;

развіцця мастацкіх здольнасцей;

назапашвання вопыту мастацка-творчай дзейнасці;

4.3. фарміраванне метапрадметных кампетэнцый: развіццё камунікатыўных, творчых, аналітычных здольнасцей; уменняў рашаць вучэбныя і жыццёвыя праблемы, несці адказнасць за вынікі індывідуальнай і калектыўнай работы. Задача вырашаецца з дапамогай:

фарміравання ўяўленняў пра цесную сувязь музыкі (мастацтва) з жыццём;

назапашвання вопыту вырашэння жыццёвых задач у працэсе мастацкай дзейнасці (у індывідуальнай, групавой і калектыўнай формах);

развіцця камунікатыўных і творчых уменняў;

назапашвання вопыту змястоўнага ацэньвання вучэбнай (музычнай) дзейнасці.

Спецыфіка вучэбнага прадмета «Музыка» праяўляецца ў адначасовым вырашэнні ўсяго комплексу задач у працэсе навучання.

5. Змест вучэбнага прадмета «Музыка» ўключае:

веды і ўменні ў галіне музычнага мастацтва;

веды і вядучыя ўменні ў галіне мастацкай культуры;

метапрадметныя (жыццёвыя) веды і ўменні.

Змест вучэбнага прадмета «Музыка» пабудаваны па лінейна-канцэнтрычным прынцыпе. На кожным этапе навучання пашыраюцца і паглыбляюцца ўяўленні навучэнцаў пра змест, жанравую аснову, форму і выразную мову музычнага мастацтва, удасканальваюцца ўменні ўспрымання і практычнай музычнай (мастацкай) дзейнасці.

З мэтай захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў кожным класе ў рамках вучэбных гадзін прадугледжваецца засваенне навучэнцамі вопыту каляндарна-абрадавых дзеянняў з улікам традыцый рэгіёна.

6. Віды дзейнасці, формы і метады навучання і выхавання.

На працягу ўсяго перыяду навучання музыцы выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці: слуханне, спевы, ігра на музычных інструментах, пластычнае інтанаванне, свабоднае дырыжыраванне, сачыненне, імправізацыя, рытмадэкламацыя, тэатралізацыя, слоўнае, каляровае, графічнае, пластычнае мадэляванне, іншыя віды мастацкай дзейнасці.

Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу з'яўляецца вучэбны занятак. Прытрымліванне прынцыпу «навучанне мастацтву ў формах самога мастацтва» вызначае прыярытэт арганізацыйных форм, якія адпавядаюць прыродзе мастацтва (урок-канцэрт, урок-гульня, урок-майстэрня, урок-тэатралізацыя, урок-кліп і іншыя формы).

Навучанне музыцы ажыццяўляецца з дапамогай выкарыстання разнастайных метадаў (наглядных, слоўных, практычных). Адмысловае значэнне мае сістэмнае выкарыстанне метадаў праблематызацыі і мадэлявання мастацка-творчага працэсу.

Пастаноўка праблем пры засваянні зместу вучэбнага прадмета «Музыка» забяспечвае разгляд музычных твораў у якасці адказаў на жыццёвыя пытанні, пададзеныя ў эмацыянальна-вобразнай форме, прадуглежвае даследаванне працэсу паходжання музыкі, прасочванне працэсу ўзнікнення з'яў і абазначэння паняццяў. Метад мадэлявання мастацка-творчага працэсу накіраваны на аднаўленне працэсуальнасці музычных з'яў, забяспечвае дзейнаснае разуменне музычнага мастацтва.

Шырокае распаўсюджванне на ўроках музыкі атрымліваюць фасілітацыйныя дыскусіі і мастацка-творчыя праекты. Фасілітацыйныя дыскусіі накіраваны на развіццё самастойнасці навучэнцаў у ходзе засваення вучэбнага матэрыялу, садзейнічаюць развіццю крытычнага мыслення, даследчых і камунікатыўных уменняў. Мастацка-творчыя праекты прадугледжваюць самастойнае рашэнне навучэнцамі вучэбнай задачы, забяспечваюць развіццё самастойнасці, здольнасці да самаарганізацыі, гатоўнасці да супрацоўніцтва, стваральнай дзейнасці, садзейнічаюць выкарыстанню набытага вопыту для вырашэння жыццёвых праблем.

Ацэначная дзейнасць паўстае ў якасці злучальнага звяна паміж пазнавальнай і пераўтваральнай дзейнасцю і з прычыны гэтага з'яўляецца неад'емнай часткай мастацкай творчасці. Пры засваенні зместу вучэбнага прадмета «Музыка» кантрольна-ацэначная дзейнасць ажыццяўляецца на славесна-змястоўнай аснове, гэта значыць ацэнка даецца словамі без выстаўлення адзнакі ў балах. Актыўнае прымяненне на ўроках музыкі атрымліваюць метады самаацэнкі і ўзаемаацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці.

7. Чаканыя вынікі вывучэння зместу вучэбнага прадмета «Музыка»:

7.1. чаканыя вынікі першага года навучання:

ведаць (мець уяўленні):

пра разнастайнасць гукаў навакольнага свету, асаблівасці музычнага гуку;

усёабдымны змест музыкі, яе жыццёвыя вытокі;

пульсацыю як жыццёвую з'яву і яе праяўленні ў музыцы;

першасныя музычныя жанры (песні, танцы, маршы) і іх ролю ў жыцці чалавека;

выразную мову музычнага мастацтва;

умець:

эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

распазнаваць у працэсе слухання першасныя музычныя жанры (песню, танец, марш);

выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці;

7.2. чаканыя вынікі другога года навучання:

ведаць (мець уяўленні):

пра сродкі музычнай выразнасці;

жанры прафесійнай музыкі (оперу, балет, сімфонію, канцэрт);

інструменты сімфанічнага аркестра;

умець:

эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

вызначаць offернае і сімфанічнае выкананне музыкі;

вызначаць па гучанні асобныя інструменты сімфанічнага аркестра;

выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці;

7.3. чаканыя вынікі трэцяга года навучання:

ведаць (мець уяўленні):

пра песеннасць, танцавальнасць, маршавасць;

інтанацыю і яе розныя значэнні;

спосабы развіцця музыкі;

музычнае формаўтварэнне, разнастайнасць музычных форм;

умець:

вызначаць песенную, танцавальную, маршавую асновы музычных твораў;

успрымаць, выконваць, ствараць інтанацыі рознага характару з выкарыстаннем магчымасцей розных відаў мастацтва;

назіраць за развіццём музыкі, самастойна ажыццяўляць яе развіццё;

увасабляць творчую задуму ў музычную (мастацкую) форму;

эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці;

7.4. чаканыя вынікі чацвёртага года навучання:

ведаць (мець уяўленні):

пра музычную культуру;

падабенствы і адрозненні ў музычных культурах розных народаў;

суадносіны народнага і кампазітарскага, класічнага і сучаснага, нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў музычным мастацтве;

камунікатыўныя магчымасці музычнай мовы;

умець:

распазнаваць па характэрных прыметах творы прафесійнай і народнай, класічнай і сучаснай музыкі;

па характэрных прыметах вызначаць прыналежнасць музычнага твора да культуры пэўнага народа;

ажыццяўляць камунікацыю з дапамогай мовы музычнага мастацтва;

эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці.

Навучанне музыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана на дасягненне навучэнцамі асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў:

асобасныя вынікі: наяўнасць у навучэнцаў цікавасці да музычнага мастацтва і патрэбнасці ў зносінах з ім; усведамленне прыналежнасці да беларускага народа, праяўленне павагі да беларускай культуры, Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь як сімвала суверэннай дзяржавы; асэнсаванне выразнасці музычнай мовы як неад’емнай і ўнікальнай часткі цэласнай сістэмы камунікацыі; уменне ажыццяўляць самаацэнку дзейнасці на славесна-змястоўнай аснове;

метапрадметныя вынікі: уменне прымяняць мастацкі спосаб пазнання свету, інтэрпрэтаваць мастацкія з’явы на аснове наладжвання цеснай сувязі мастацтва і жыцця; жаданне і ўменне ўступаць у мастацкую камунікацыю; жаданне і ўменне творча вырашаць вучэбныя і жыццёвыя задачы з выкарыстаннем выразных сродкаў розных відаў мастацтва; уменне ажыццяўляць мастацкую (музычную) дзейнасць індывідуальна, у групах, калектыўна;

прадметныя вынікі: уменні эмацыянальна і свядома ўспрымаць музыку, спасцігаць яе вобразны змест, выказваць уласнае стаўленне да праслуханага з дапамогай ацэначных меркаванняў; характарызаваць кампазітарскія творы і ўзоры народнай творчасці ў аспектах зместу, сродкаў музычнай выразнасці, спосабаў развіцця, формы; вызначаць жанравую аснову музычнага твора; распазнаваць музыку, створаную кампазітарамі, і ўзоры традыцыйнай музычнай культуры; знаходзіць падабенства ў змесце і адрозненні ў выразнасці моў музычных культур народаў свету; пазнаваць на слых шэдэўры музычнага мастацтва; выразна спяваць і музыцыраваць на музычных інструментах; увасабляць уласную творчую задуму ў розных відах музычнай дзейнасці; выконваць Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь і правільна паводзіць сябе пры яго афіцыйным выкананні.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў I КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

(1 гадзіна ў тыдзень, усяго 34 гадзін)

### СВЕТ ГУКАЎ (8 гадзін)

#### Гучальны свет вакол нас (1 гадзіна)

Гукавая разнастайнасць навакольнага свету (свету прыроды і чалавека). Магчымасць узнаўлення гукаў «гучальнымі» жэстамі.

#### Прыродныя і механічныя гукі (1 гадзіна)

Характэрныя асаблівасці прыродных і механічных гукаў. Разнастайнасць гукаў прыроды. Крыніцы механічных гукаў.

Музыка – краіна гукаў (1 гадзіна)

Асаблівасці музычных гукаў. Адрозненне музычных гукаў ад гукаў прыродных і механічных.

Карціны, створаныя пры дапамозе гукаў (2 гадзіны)

Спалучэнні гукаў, іх выяўленчыя магчымасці. Стварэнне гукавых карцін.

Настрой, перададзены пры дапамозе гукаў (2 гадзіны)

Разнастайнасць настрояў (пачуццяў) чалавека, станаў прыроды. Спалучэнні гукаў, іх выразныя магчымасці.

Абагульняючы ўрок па тэме «Свет гукаў» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Музыка Н. Сакалоўскага, словы М. Клімковіча і У.Карызны.

Беларускія народныя песні «Ладу-ладу-ладкі», «Белабока сарока», «Дожджык», «Іграў я на дудцы».

«Где живет музыка». Музыка і словы В. Каваліва.

«Что нам осень принесет?». Музыка З. Левінай, словы Л. Някрасавай.

«Першая настаўніца». Музыка В. Каваліва, словы С. Грахоўскага.

«Насупа». Музыка В. Каваліва, словы М. Чарняўскага.

«Слово на ладошках». Музыка А. Паплянавай, словы Н. Пікулевай.

«Солнышко», «Дождик». Музыка А. Цілічэевай, словы Л. Дымавай.

«Осень». Музыка М. Красева, словы М. Івенсэн.

«По грибы». Музыка У. Алоўнікава, словы Л. Алтухова.

С. Пракоф’еў. «Дождж і вясёлка», «Казачка» (са зборніка фартэпіянных п’ес «Дзіцячая музыка»).

Г. Вагнер. «Зязюлька», «Песенька».

Р. Шуман. «Песенька жняцоў», «Паляўнічая песенька» (са зборніка фартэпіянных п’ес «Альбом для юнацтва»).

Э. Грыг. «Птушачка».

А. Хачатуран. «Вячэрняя казка».

П. Падкавыраў. «Ку-ку».

Д. Шастаковіч. «Катрынка».

Ж.-Ф. Рамо. «Курыца».

М. Рымскі-Корсакаў. «Акіян – мора сіняе» (аркестравае ўступленне да оперы «Садко»).

Віды і спосабы дзейнасці: слуханне і распазнаванне гукаў (прыродных, механічных, музычных); узнаўленне гукаў з дапамогай «гучальных» жэстаў і гукаперайманні; узнаўленне музычных гукаў голасам і на музычных інструментах; «маляванне голасам», развучванне і выкананне песень, у якіх прысутнічае выразны і выяўленчы пачатак; дэкламацыя вершаў з выкарыстаннем гукавыяўленчых эфектаў; «агучванне» карцін; стварэнне гукавых кампазіцый на зададзеную тэму; слуханне і распазнаванне настрояў, перададзеных з дапамогай музычных гукаў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):

пра разнастайнасць гукаў навакольнага свету;

прыродныя і механічныя гукі;

асаблівасці музычнага гуку.

Умець (група прыватных уменняў):

услухоўвацца ў гукі навакольнага свету; распазнаваць прыродныя, механічныя і музычныя гукі;

узнаўляць музычныя гукі (голасам і на музычных інструментах);

распазнаваць настроі (пачуцці, станы), перададзеныя з дапамогай музычных гукаў;

выкарыстоўваць прыродныя, механічныя, музычныя гукі ва ўласнай мастацкай дзейнасці, пры стварэнні гукавых карцін.

Умець (група ключавых уменняў):

удзельнічаць у калектыўнай мастацка-творчай дзейнасці;

знаходзіць спосабы самавыяўлення сродкамі музычнага мастацтва;

самастойна ацэньваць вынікі вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:

у ходзе наведвання музычных канцэртаў;

самастойнай музычнай і мастацкай дзейнасці;

дамашнім музіцыраванні.

Як расказвае музыка (8 гадзін)

Што і як можна расказаць пры дапамозе гукаў (1 гадзіна)

Перадача ў музыцы жыццёвага зместу. Выяўленчасць і выразнасць у музыцы.

Гукаперайманне (1 гадзіна)

Гукаперайманне як імітацыя гучання навакольнага свету. Выяўленчыя магчымасці гукапераймання. Прыёмы гукапераймання.

Святло і цень у музыцы (лад) (1 гадзіна)

Спосабы перадачы святла і ценю ў музыцы. Выразныя магчымасці ладу.

Хуткае і павольнае ў музыцы (тэмп) (1 гадзіна)

Спосабы перадачы хуткага і павольнага ў музыцы. Выразныя магчымасці тэмпу.

Гучнае і ціхае ў музыцы (дынаміка) (1 гадзіна)

Спосабы перадачы гучнага і ціхага ў музыцы. Выразныя магчымасці дынамікі.

Халоднае і цёплае ў музыцы (тэмбр) (1 гадзіна)

Асаблівасці афарбоўкі гучання музычных інструментаў і вакальных галасоў. Разнастайнасць музычных тэмбраў. Халоднае і цёплае гучанне.

Высокія і нізкія гукі (рэгістр) (1 гадзіна)

Вышыня гучання музычных інструментаў і вакальных галасоў; нізкія і высокія ўчасткі дыяпазону. Выразныя і выяўленчыя магчымасці высокіх і нізкіх гукаў.

Абагульняючы ўрок па тэме «Як расказвае музыка» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

Беларускія народныя песні «Чубаценькі верабей», «Гэй ты, воўчанька».

«Каждый по-своему маму поздравит». Музыка Т. Патапенка, словы М. Івенсэн.

«Грустная песня». Музыка А. Цілічэевай, словы Л. Дымавай.

«Яліначка». Музыка Л. Бекмана, словы Р. Кудашавай, пераклад В. Жуковіча.

«Зімовая калыханка». Музыка Л. Свердзеля, словы В. Вярбы.

«Добрый жук». Музыка А. Спадавекія, словы Я. Шварца.

«Догадайся, кто поет». Музыка А. Цілічэевай, словы А. Гангава.

«Здравствуй, замушка-зима». Музыка А. Філіпенка, словы Т. Волгінай.

«Новогодняя хороводная». Музыка А. Астроўскага, словы Ю. Ляднёва.

«Бубенчики». Музыка А. Цілічэевай, словы М. Далінава.

«Песенка друзей». Музыка В. Герчык, словы Я. Акіма.

«Новогодняя». Музыка В. Каваліва, словы А. Навуменкі.

І. Брамс. «Пятрушка».

Р. Шуман. «Смелы яздок».

«Вясёлы селянін, які вяртаецца з працы», «Дзед Мароз» (са зборніка фартэпіянных п’ес «Альбом для юнацтва»).

Р. Сурус. «Галоп», «Калыханка», «Жарты».

К. Сен-Санс. «Куры і пеўні», «Антылопы», «Чарапаха» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).

К. Цесакоў. «Гульня ў снежкі», «Снежны вальс».

С. Картэс. «У некаторым царстве» (з Маленькай сюіты для фартэпіяна «Казка»).

Ж. Ф. Рамо. «Тамбурын».

Д. Кабалеўскі. «Клоўны».

У. Агафоннікаў. «Сані са званочкамі».

П. Чайкоўскі. «Вальс снежных камякоў», «Танец Феі Дражэ» (з балета «Шчаўкунчык»).

Віды і спосабы дзейнасці: слуханне і параўнанне музычных твораў, якія выконваюцца ў розных тэмпах, у розных рэгістрах, з рознай дынамікай; слуханне і параўнанне сугуччаў, што перадаюць святло і цень (лад) у музыцы; распазнаванне афарбоўкі гучання голасу ці музычнай прылады па слыху; выразнае чытанне вершаў з рознай хуткасцю, з рознай сілай гуку, з рознай вышынёй гуку; выкананне музычных папевак з выкарыстаннем розных сродкаў музычнай выразнасці; выкананне мелодый з пластычным інтанаваннем; развучванне і выкананне песень з выкарыстаннем музычна-рытмічных рухаў, з суправаджэннем на дзіцячых музычных інструментах; інсцэніроўка песень; агучванне вершаў з выкарыстаннем музычных інструментаў; стварэнне гукавых карцін на зададзеную тэму (з выкарыстаннем гукапераймання, магчымасцей сродкаў музычнай выразнасці).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):

пра выразнасць і выяўленчасць ў музыцы;

гукаперайманне;

сродкі музычнай выразнасці (святло і цень у музыцы, хуткасць выканання, гучнасць, афарбоўку голасу і інструментаў);

разнастайнасць музычных інструментаў.

Умець (група прыватных уменняў):

распазнаваць перадачу ў музыцы святла і ценю, хуткага і павольнага; гучнага і ціхага, халоднага і цёплага, высокага і нізкага;

распазнаваць і выкарыстоўваць ва ўласнай мастацкай дзейнасці прыёмы гукапераймання;

выкарыстоўваць ва ўласнай мастацкай дзейнасці розныя спосабы адлюстравання ў музыцы святла і ценю, хуткага і павольнага, гучнага і ціхага, халоднага і цёплага, высокага і нізкага;

ствараць гукавыя карціны.

Умець (група ключавых уменняў):

удзельнічаць у калектыўнай мастацка-творчай дзейнасці;

знаходзіць спосабы самавыяўлення сродкамі музычнага мастацтва;
самастойна ацэньваць вынікі вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:
у ходзе наведвання музычных канцэртаў;
самастойнай музычнай і мастацкай дзейнасці;
дамашнім музіцыраванні.

З ЧАГО ВЫРАСЛА МУЗЫКА (9 гадзін)

З чаго пачынаецца музыка (1 гадзіна)
Паходжанне музыкі. Роля музыкі ў жыцці чалавека.

Песня, танец, марш (1 гадзіна)
«Першасныя» музычныя жанры. Песня, танец, марш.

Жывы пульс музыкі (1 гадзіна)
Пульсацыя (метр). Моцная і слабыя долі «пульсу» (метра).

Якія бываюць маршы (1 гадзіна)
Жанр марша. Розныя віды маршаў (спартыўны, ваенны і іншыя віды). Рытмічны малюнак марша.

Якія бываюць танцы (2 гадзіны)
Жанр танца. Відавая разнастайнасць танцаў.

Песня ў жыцці чалавека (1 гадзіна)
Жанр песні. Песні народныя і кампазітарскія. Жыццёвы змест песень. Выразнасць выканання песень.

Песня, танец, марш сустракаюцца ў адным музычным творы (1 гадзіна)
Песня-танец, песня-марш. Асаблівасці песень-танцаў і песень-маршаў.

Абагульняючы ўрок па тэме «З чаго вырасла музыка» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял
Беларуская вясновая песня «Ідзі, зіма, да Кракава».
Беларуская дзіцячая гульня «А на гары мак».
«У нашым класе» (марш, полька, вальс, песня). Музыка Д. Кабалеўскага.
«Калыханка». Музыка В. Раінчыка, словы Г. Бураўкіна.
«Песенка о гномиках». Музыка і словы В. Каваліва.
«Бравые солдаты». Музыка А. Філіпенка, словы Т. Волгінай.
«Петь приятно и удобно». Музыка В. Кісцяня, словы У. Сцяпанава.
«Роднулечка». Музыка В. Каваліва, словы В. Драбышэўскай.
«Пусть всегда будет солнце». Музыка А. Астроўскага, словы Л. Ашаніна.
«Веселый музыкант». Музыка А. Філіпенкі, словы Т. Волгінай.
«Солнечные зайчики». Музыка А. Паплянавай, словы В. Татарынава.
«Барабан». Музыка Л. Сімаковіч, словы Б. Жанчака.
«Песня юных защитников Отечества». Музыка В. Каваліва, словы С. Лук’янавай.
«Птенчики». Музыка А. Цілічэевай, словы М. Далінава.
Нямецкая народная песня «Весна», рускі тэкст С. Каратыгінай.
«Солдатик». Музыка Г. Курына, словы М. Карэма, пераклад М. Кудзінава.
«Начинаем перепляс». Музыка С. Сасніна, словы П. Сіняўскага.
«Мама». Музыка Л. Бакалава, словы С. Вігдарава.

Дж. Вердзі. «Марш» (з оперы «Аіда»).

Л. Бакерыні. «Менуэт».

П. Чайкоўскі. «Песня жаўрука», «Марш драўляных салдацікаў» (са зборніка фартэпіянных п’ес «Дзіцячы альбом»).

Д. Кабалеўскі. «Танец маладога бегемота».

С. Баневіч. «Вальс на балі», «Паўночная полька» (з альбома «Па казках Ганса Хрысціяна Андэрсена»).

В. Кузняцоў. «Марш».

Г. Гарэлава. «Танцуючы таўстун».

К. Сен-Санс. «Слон» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).

М. Мусаргскі. «Гапак» (з оперы «Сарочынскі кірмаш»).

М. Глінка. «Полька».

С. Пракоф’еў. «Марш».

С. Чарнецкі. «Сустрэчны марш».

М. Блантэр. «Футбольны марш».

В. Агапкін. «Развітанне славянкі».

С. Рахманінаў. «Італьянская полька».

Д. Шастаковіч. «Вальс-жарт».

Л. Шлег. «Калыханка маці».

Віды і спосабы дзейнасці: слуханне і распазнаванне мелодый з двухдольнай і трохдольнай пульсацыяй; узнаўленне двухдольнай і трохдольнай пульсацыі з дапамогай гучальных жэстаў, двухскладовых і трохскладовых слоў; слуханне музычных твораў у жанры марша, танца, песні, песні-танца, песні-марша; суправаджэнне музычных кампазіцый выразнымі рухамі; выкананне рытмічнага акампанементу да маршаў, танцаў (полькі, вальса), песень; выразнае выкананне песень з танцавальнымі рухамі, элементамі тэатралізацыі; падбор інструментаў для выканання акампанементу ў двухдольным і трохдольным памерах; складанне мелодыі калыханкі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):

пра першасныя музычныя жанры (песні, танцы, маршы) і іх ролю ў жыцці чалавека;

відавую разнастайнасць песень, танцаў, маршаў;

метр (пульс) і яго ролю ў музыцы.

Умець (група прыватных уменняў):

распазнаваць песню, танец, марш; адрозніваць іх віды;

вылучаць моцныя і слабыя долі «пульсу»;

узнаўляць раўнамерную пульсацыю;

выконваць рытмічны акампанемент да знаёмай мелодыі з паказам моцных і слабых долей;

выразна выконваць песні;

ствараць з дапамогай гучальных жэстаў рытмічны акампанемент.

Умець (група ключавых уменняў):

удзельнічаць у калектыўнай мастацка-творчай дзейнасці;

знаходзіць спосабы самавыяўлення сродкамі музычнага мастацтва;

самастойна ацэньваць вынікі вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:

у ходзе наведвання музычных канцэртаў;

самастойнай музычнай і мастацкай дзейнасці;

дамашнім музіцыраванні.

ПРА ШТО РАСКАЗВАЕ МУЗЫКА (9 гадзін)

Музычныя гісторыі, расказаныя кампазітарамі (1 гадзіна)

«Музычныя гісторыі». Узаемасувязь сродкаў музычнай выразнасці, выкарыстаных аўтарам, са зместам музычных твораў.

Музыка перадае пачуцці чалавека (2 гадзіны)

Выразныя магчымасці музыкі. Перадача ў музыцы ўнутранага стану чалавека. Перадача пачуццяў (пяшчоты, радасці, трывогі), настрояў (весялосці, бадзёрасці, смутку).

Музыка адлюстроўвае розныя рысы характару (1 гадзіна)

Выяўленча-выразныя магчымасці музыкі. Адлюстраванне ў музыцы характару чалавека.

Музыка перадае рух (1 гадзіна)

Выяўленчыя магчымасці музыкі. Перадача ў музыцы руху.

Музыка малюе карціны (2 гадзіны)

Перадача ў музыцы вобразаў прыроды. Поры года ў музыцы.

Музыка народнага свята (1 гадзіна)

Музычны рэпертуар народнага свята. Роля музыкі ў народным свяце.

Абагульняючы ўрок па тэме «Пра што расказвае музыка» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

Эстонская народная песня «ял волынку наш сосед».
Украінская народная песня «Иди, иди, дождичек».
«Пастушок». Музыка П. Падкавырава, словы Я. Журбы.
«Окликание дождя». Музыка А. Лядава, словы народныя.
«Бесконечная песенка». Музыка В. Каваліва, словы В. Семярніна.
«Прыляцелі шпакі». Музыка П. Падкавырава, словы Я. Пушчы.
«Соловейко». Музыка А. Філіпенкі, словы Г. Бойкі.
«Рыжий пёс». Музыка Г. Струвэ, словы У. Сцяпанава.
«Дзік». Музыка І. Арсеева, словы Л. Дымавай.
«Ягорачка». Музыка В. Сярых, словы народныя.
Э. Грыг. «Матылёк».
Ж. Бізэ. «Дзік».
Л. К. Дакен. «Зязюля».
П. Чайкоўскі. «Хвароба лялькі», «Новая лялька» (са зборніка фартэпіянных п’ес «Дзіцячы альбом»).
Г. Свірыдаў. «Упарты».
К. Сен-Санс. «Лебедзь» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).
А. Залётнеў. «Балет мышэй».
Д. Кабалеўскі. «Труба і барабан», «Упарты брацік», «Сумная гісторыя».
В. Рэбікаў. «Мядзведзь».
А. Лядаў. «Музычная табакерка», «Пачвара».
І. Арсееў. «У госці» («Пехатой», «На веласіпедзе», «На машыне»).

Віды і спосабы дзейнасці: вызначэнне зместу твора па выяўленча-выразных асаблівасцях музыкі; выкананне песень з выкананнем выразных рухаў; агучванне вершаў з выкарыстаннем гукаперайманняў, ігрой на музычных інструментах; складанне мадэлі музычнага твора на аснове карціны, верша, казкі; складанне гукавых партрэтаў казачных персанажаў; інструментальная (вакальная) імправізацыя на зададзеную тэму; інсцэніроўка народнага свята.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ
ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):
пра сувязь зместу твораў са сродкамі музычнай выразнасці, выкарыстанымі кампазітарамі;
ролю музыкі ў перадачы пачуццяў чалавека;
ролю музыкі ў перадачы руху;
ролю музыкі ў стварэнні партрэта;
ролю музыкі ў народным свяце.

Умець (група прыватных уменняў):
знаходзіць узаемасувязь зместу музычнага твора з выяўленча-выразнымі асаблівасцямі музыкі;
вызначаць перададзеныя ў музыцы пачуцці;
выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі.

Умець (група ключавых уменняў):
удзельнічаць у калектыўнай мастацка-творчай дзейнасці;
знаходзіць спосабы самавыяўлення сродкамі музычнага мастацтва;
самастойна ацэньваць вынікі навучальнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:
у ходзе наведвання музычных канцэртаў;
самастойнай музычнай і мастацкай дзейнасці;
дамашнім музіцыраванні.

## ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў II КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

(1 гадзіна ў тыдзень, усяго 34 гадзіны)

СРОДКІ МУЗЫЧНАЙ ВЫРАЗНАСЦІ (16 гадзін)

Як кампазітары, выканаўцы і слухачы разумеюць адзін аднаго (1 гадзіна)
Выразнасць музычнай мовы. Мова музыкі ў дзейнасці кампазітара, выканаўцы, слухача.

Мелодыя – каралева музыкі (2 гадзіны)
Роля мелодыі ў музычным творы. Магчымасць выканання мелодыі голасам і на музычных інструментах. Розныя спосабы фіксацыі вышыні і працягласці гукаў. Ноты. Нотны стан. Розныя спосабы фіксацыі (запісу) мелодыі.

Рытм – залаты ключык музыкі (2 гадзіны)
Рытм як першаасанова музычнай мовы. Розныя спосабы запісу рытмічных рысункаў. Сістэма працягласцей. Рытмасклады. Спосабы чытання рытмічных малюнкаў. Рытмічны акампанемент.

Лад – гармонія, парадак паміж гукамі (2 гадзіны)
Лад як сродак музычнай выразнасці. Мажор. Мінор. Роля ладу ў стварэнні музычнага вобраза. Абумоўленасць выбару ладу зместам музыкі.

Тэмп у жыцці і ў музыцы (2 гадзіны)

Тэмп як сродак музычнай выразнасці. Роля тэмпу ў стварэнні і ўзнаўленні выканаўцам музычнага вобраза. Абумоўленасць выбару тэмпу зместам музыкі.

Сіла гуку (дынамічныя адценні) (2 гадзіны)

Дынаміка як сродак музычнай выразнасці. Роля дынамікі ў стварэнні і аднаўленні выканаўцам музычнага вобраза. Дынамічныя адценні. Абумоўленасць выбару сілы гуку зместам музыкі.

Рэгістр – краіна гукаў: высокіх, сярэдніх і нізкіх (2 гадзіны)

Рэгістр як сродак музычнай выразнасці. Роля рэгістра ў стварэнні музычнага вобраза. Абумоўленасць выбару рэгістра зместам музыкі.

Тэмбр – афарбоўка музычных галасоў (2 гадзіны)

Тэмбр як сродак музычнай выразнасці. Вакальныя і інструментальныя тэмбры. Роля тэмбру ў стварэнні музычнага вобраза. Абумоўленасць выбару тэмбру зместам музыкі.

Абагульняючы ўрок па тэме «Сродкі музычнай выразнасці» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Музыка Н.Сакалоўскага, словы М. Клімковіча і У. Карызны.

Беларускія народныя песні «Ляцелі гусёлкі», «Перапёлачка», «Запражыце сівых коней», «Грушка», «Каляда, каляда, дай, баба, пірага», «Ішла Каляда», «Люлі, люлі, цэлы дом спіць».

«Песня о Родине». Музыка і словы С. Галкінай.

«Родны бусел». Музыка С. Галкінай, словы Н. Галіноўскай.

«Кружева осенние». Музыка і словы Я. Жабко.

«Звуки музыки». Музыка Р. Роджэрса, рускі тэкст М. Цэйтлінай.

«До, рэ, мі, фа, соль...». Музыка А. Астроўскага, словы З. Пятрова.

«Начавала ночка». Музыка В. Каваліва, словы У. Мазго.

«Белочки». Музыка З. Левінай, словы Л. Някрасавай.

«Пешки – крепкие орешки». Музыка Г. Струвэ, словы В. Кручкова.

«Ежики смеются». Музыка У. Дарохіна, словы К. Чукоўскага.

«Кракадзіл і Чабурашка». Музыка І. Арсеева.

«Мама». Музыка Ж. Буржоа і Т. Папа, словы Ю. Энціна.

«Карусель». Музыка Д. Кабалеўскага, словы І. Рахіла.

«Попутная песня». Музыка М. Глінкі, словы Н. Кукальніка.

«Веселые путешественники». Музыка М. Старакадомскага, словы С. Міхалкова.

«Игра в гостей». Музыка Д. Кабалеўскага, словы І. Рахіла.

«Форель». Музыка Ф. Шуберта, рускі тэкст У. Кастамарава.

«Сурок». Музыка Л. ван Бетховена, словы М. Райскага.

«Воздушная песня». Музыка М. Старакадомскага, словы Я. Далматоўскага.

«Малиновка». Музыка Л. ван Бетховена, словы Г. Бюргера.

«Цымбалісты». Музыка Ю. Семяняко, словы Э. Агняцвет.

«Музыканты». Музыка А. Рэмізоўскай, словы Э. Агняцвет.

«Зіма». Музыка І. Лучанка, словы Я. Коласа.

«Зимушка-зима». Музыка А. Маркелава, словы Т. Сучковай.

«Батлеемска зорка». Музыка і словы Я. Петрашэвіча.

І. Жыновіч. «Мелодыя».

В. Карэтнікаў. «Маленькі каўбой».

Д. Кабалеўскі. «Зайчык дражніць медзведзяня».

С. Майкапар. «Рэха ў гарах».

Б. Дварыёнас. «Драўляны конік».

В. Салманаў. «Раніца ў лесе», «Вечар».
Э. Грыг. «Танец эльфаў».
С. Пракоф'еў. Сімфанічная казка «Пеця і воўк».
Л. ван Бетховен. «Вясёлая. Сумная».

Віды і спосабы дзейнасці: распазнаванне сродкаў музычнай выразнасці ў працэсе слухання музычных твораў; параўнанне гучання мелодыі, якая выконваецца з акампанементам і без акампанементу; пластычнае інтанаванне мелодый (з узыходзячым, сыходным, паступенным і скачкападобным рухам); выкананне рытмічных малюнкаў пры дапамозе гучальных жэстаў і рытмаскладоў; графічнае адлюстраванне рытму на пісьме; запіс нот на нотаносьбіты; запіс рытмаформул чацвяртымі і восьмымі працягласцямі; рытмадэкламацыя вершаваных тэкстаў; выкананне рытмічных партытур з выкарыстаннем «гучальных» жэстаў; агучванне графічных запісаў мелодыі голасам і на гукавышынных музычных інструментах; выкананне рытмічных малюнкаў на форце і на піяна (гучальнымі жэстамі, голасам і на інструментах); выкананне рытмічнага акампанементу да песні; перадача асаблівасцей выразнай мовы музычнага твора пры дапамозе колеру, слова, пластыкі; каляровае і пластычнае мадэляванне гучных і ціхіх гукаў; слуханне музычных твораў у выкананні розных вакальных галасоў, розных інструментаў; слоўнае апісанне гучання інструментаў; суаднясенне тэмбраў музычных інструментаў з канкрэтнымі вобразамі; вызначэнне вакальных і інструментальных тэмбраў у працэсе слухання музыкі; развучванне і выразнае выкананне твораў; выкананне песень з элементамі тэатралізацыі; інструментальная імправізацыя на зададзеную тэму з выкарыстаннем выразных магчымасцей дынамікі, тэмпу, рэгістра; стварэнне мадэлі мелодыі да вершаванага тэксту, аргументаваны адбор сродкаў музычнай выразнасці; складанне мелодыі на словы двухрадкоўяў, чатырохрадкоўяў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):
пра сродкі музычнай выразнасці (мелодыю, рытм, лад, тэмп, дынаміку, рэгістр, тэмбр);
сістэму працягласцей;
дынамічныя адценні.

Умець (група прыватных уменняў):
вызначаць сродкі музычнай выразнасці (лад, тэмп, дынаміку, рэгістр, тэмбр) у працэсе слухання музыкі;
асэнсавана выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці (тэмп, дынаміку, тэмбр) у выканальніцкай дзейнасці;
узнаўляць і запісваць простыя рытмічныя малюнкі;
выконваць песню з рытмічным акампанементам;
самастойна мадэляваць мастацкі вобраз, выкарыстоўваючы выразныя і выяўленчыя магчымасці мелодыі, рытму, ладу, тэмпу, дынамікі, рэгістра, тэмбру;
эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу.

Умець (група ключавых уменняў):
выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці для творчага самавыяўлення;
удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;
даваць змястоўную ацэнку вынікам індывідуальнай і калектыўнай мастацкай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:
у ходзе наведвання музычных канцэртаў;
самастойнай музычнай і мастацкай дзейнасці;
дамашнім музіцыраванні.

ПАДАРОЖЖА Ў МУЗЫЧНЫЯ КРАІНЫ – ОПЕРУ, БАЛЕТ, СІМФОНІЮ, КАНЦЭРТ
(18 гадзін)

Песня, танец, марш клічуць у падарожжа (1 гадзіна)

Песня, танец, марш у жанрах прафесійнай музыкі. Асаблівасці выкарыстання песні, танца, марша ў оперы, балеце, сімфоніі, канцэрце.

Інструменты сімфанічнага аркестра (2 гадзіны)

Сімфанічны аркестр. Групы інструментаў сімфанічнага аркестра. Выразныя магчымасці сімфанічнага аркестра. Роля дырыжора.

Музычнае падарожжа ў краіну Оперу (3 гадзіны)

Опера. Характэрныя асаблівасці оперы. Оперныя нумары. Песня, танец, марш у оперным спектаклі. Асаблівасці існавання песні, танца, марша ў оперы.

Музычнае падарожжа ў краіну Балет (3 гадзіны)

Балет. Характэрныя асаблівасці балета. Роля пластычных сродкаў у стварэнні мастацкага вобраза. Танец, марш у балетным спектаклі. Асаблівасці існавання танца, марша ў балеце.

Музычнае падарожжа ў краіну Сімфонію (2 гадзіны)

Сімфонія. Характэрныя асаблівасці сімфоніі. Асаблівасці існавання песні, танца, марша ў сімфоніі. Мелодыі песень, танцаў, маршаў як тэмы сімфанічных твораў.

Музычнае падарожжа ў краіну Канцэрт (2 гадзіны)

Канцэрт. Характэрныя асаблівасці канцэрта. Прынцып спаборніцтва ў канцэрце. Роля аркестра і саліруючага інструмента. Мелодыі песень, танцаў, маршаў у канцэрце.

Як сябруюць з музыкай іншыя віды мастацтва (3 гадзіны)

Узаемасувязь музыкі з іншымі відамі мастацтва. Узаемапранікненне мастацтваў. Мюзікл. Музыка кіно і тэлебачання.

Куды прывялі нас песня, танец, марш (1 гадзіна)

Опера, балет, сімфонія, канцэрт – жанры прафесійнай музыкі.

Абагульняючы ўрок па тэме «Падарожжа ў музычныя краіны – Оперу, Балет, Сімфонію, Канцэрт» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

Беларускія народныя песні: «Саўка ды Грышка», «Стара бабуленька козліка мела», «Вясна-красна, а зіма хараша», «Чаму табе, Масленка, ды не сем нядзель?», «Вяснянка», «Чырвонае кока», «Ды была ў бабкі курка рабенька», «Памажы, Божа, нам вясну гукаць».

Украінская народная песня «Журавель».

Руская народная песня «Уж как по мосту-мосточку».

«Студзень». Музыка М. Наско, словы А. Дзяружынскага.

«Я красиво петь могу». Музыка В. Кісценя, словы У. Сцяпанава.

«Песенка о дикции». Музыка В. Кісценя, словы В. Сарокінай.

«Мядзведзеў сон». Музыка Э. Зарыцкага, словы В. Жуковіча.

«Солнечная капель». Музыка С. Сасніна, словы І. Вахрушавай.

«Песня о волшебном цветке». Музыка Ю. Чычкова, словы М. Пляцкоўскага.

«Ручей». Музыка М. Парцхаладзэ, пераклад з грузінскага А. Гурына.

«Вожык». Музыка А. Чыркуна, словы В. Лукшы.

«Шпак». Музыка М. Анцава, словы Я. Журбы.

«Липка». Музыка М. Красева, словы П. Варанько, пераклад з украінскага С. Маршака.

«Ничего на свете лучше нету». Музыка Г. Гладкова, словы Ю. Энціна.

«Мульцікі-пульцікі». Музыка і словы Я. Жабко.

«Бу-ра-ти-но!». Музыка А. Рыбнікава, словы Ю. Энціна (з тэлефільма «Прыгоды Бураціна»).

«Хрыстос Васкрос». Музыка і словы Л. Кебіч.

«Наша Перамога». Музыка А. Чыркуна, словы У. Карызны.

«Наш край». Музыка Д. Кабалеўскага, словы А. Прышэльца.

«Прекрасен мир поющий». Музыка Л. Абелян, словы У. Сцяпанава.

Аўстрыйская народная песня «Козлік».

«Прынц і Ружа». Музыка М. Сацуры, словы Л. Дранько-Майсюка.

Нямецкая народная песня «Наш оркестр».

Г. Пукст. «Дзіцячы танец і хор», «Піянерская полька» (з оперы «Марынка»).

Я. Глебаў. «Бульба» (з балета «Мара»).

Я. Глебаў. Адажыа з балета «Маленькі прынц».

А. Хадоска. «Бураціна», «Карабас» (з балета «Залаты ключык»).

М. Коваль. Фрагменты з оперы «Воўк і сямёра казлянят» (тэмы Малыша, Балбатушкі, Усёзнайкі, Таптушкі, Бадайкі. Калыханка Мамы-казы, два хоры казлянят, сцэна «Гульні казлянят і напад Воўка», «Ваяўнічы марш», фінал).

Д. Кабалеўскі. Канцэрт № 3 для фартэпіяна з аркестрам (частка II).

М. Красеў. Заключны хор з оперы «Муха-цакатуха».

М. Глінка. Марш Чарнамора з оперы «Руслан і Людміла».

М. Рымскі-Корсакаў. «Тры цуды» (з оперы «Казка пра цара Салтана»).

П. Чайкоўскі. Сімфонія № 2 (частка IV).

П. Чайкоўскі. Хор сялян з оперы «Яўген Анегін».

П. Чайкоўскі. Неапалітанскі танец з балета «Лебядзінае возера».

П. Чайкоўскі. Марш з балета «Шчаўкунчык».

П. Чайкоўскі. «Вальс» (з балета «Спячая прыгажуня»).

А. Глазуноў. Сімфонія № 1 (частка II).

С. Пракоф'еў. «Вальс», «Поўнач» (з балета «Папялушка»).

Ж. Бізэ. Марш Тарэадора з оперы «Кармэн».

Віды і спосабы дзейнасці: вызначэнне жанравай асновы оперных, балетных нумароў; слуханне і аналіз оперных нумароў у выкананні мужчынскіх і жаночых галасоў; слуханне і выяўленне жанравай асновы фрагментаў сімфоній, канцэртаў; назіранне за «жыццём» народных песень у оперы, сімфоніі, канцэрце; падбор выразных рухаў, якія адпавядаюць характару музыкі; суправаджэнне гучання оперных, балетных нумароў ігрой на дзіцячых музычных інструментах; прагляд і аналіз оперных, балетных нумароў наконт узаемадзеяння ў іх розных відаў мастацтва;

слуханне і аналіз музычнай мовы сімфоній, канцэртаў; выяўленне асаблівасцей існавання песні, танца, марша ў сімфоніі, канцэрце; вызначэнне тэмбраў інструментаў сімфанічнага аркестра; характарыстыка тэмбраў музычных інструментаў, якія ўдзельнічаюць у стварэнні вобразаў герояў сімфанічнай казкі; назіранне за «спаборніцтвам» саліруючага інструмента і аркестра ў канцэрце; развучванне і выкананне на музычных інструментах рытмічнай двухгалоснай (трохгалоснай) партытуры з танцавальнай або маршавай жанравай асновай (на выбар педагагічнага работніка); выкананне песень з элементамі тэатралізацыі і інструментальным суправаджэннем; мадэляванне мастацка-творчага працэсу па стварэнні опернага, балетнага спектакля, сімфанічнай казкі на вядомы казачны сюжэт; стварэнне элементаў дэкарацый опернага, балетнага спектакля (на выбар навучэнцаў).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ
ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):
пра жанры прафесійнай музыкі (оперу, балет, сімфонію, канцэрт);
групы інструментаў сімфанічнага аркестра.

Умець (група прыватных уменняў):
вызначаць выкананне опернай і сімфанічнай музыкі;
распазнаваць жанры песні, танца, марша ў працэсе ўспрымання фрагментаў з оперы, балета, сімфоніі, канцэрта;
вызначаць па гучанні асобныя інструменты сімфанічнага аркестра;
сачыць за спаборніцтвам саліруючага інструмента і аркестра ў канцэрце;
выконваць песні з элементамі тэатралізацыі і інструментальным суправаджэннем;
ствараць мадэль музычнага спектакля на казачны сюжэт;
эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;
ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара.

Умець (група ключавых уменняў):
выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці для творчага самавыяўлення;
удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;
даваць змястоўную ацэнку вынікам індывідуальнай і калектыўнай мастацкай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:
у ходзе наведвання музычных спектакляў і канцэртаў;
у дамашняй мастацкай практыцы;
пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых праектаў.

## ГЛАВА 4
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў III КЛАСЕ.
## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

(1 гадзіна ў тыдзень, усяго 35 гадзін)

ПЕСЕННЫ, ТАНЦАВАЛЬНЫ І МАРШАВЫ ХАРАКТАР МУЗЫЧНАЙ МОВЫ (8 гадзін)

Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы (1 гадзіна)
Песеннасць, танцавальнасць, маршавасць. Адрозненне песеннасці, танцавальнасці, маршавасці ад песні, танца, марша.

Песенны характар музычнай мовы (2 гадзіны)
Характэрныя асаблівасці песеннай музычнай мовы. Інструментальная музыка песеннага характару. Перадача песеннага характару музыкі з дапамогай пластычнага інтанавання, графічнага мадэлявання. Стварэнне музычных фрагментаў песеннага характару.

Танцавальны характар музычнай мовы (2 гадзіны)
Характэрныя асаблівасці танцавальнай музычнай мовы. Вакальная і інструментальная музыка танцавальнага характару. Падкрэсліванне танцавальнага характару музыкі пры дапамозе рытмічнага акампанементу. Перадача танцавальнага характару музыкі з дапамогай графічнага мадэлявання, выразных рухаў. Стварэнне рытмічнага акампанементу да музычнага твора танцавальнага характару.

Маршавы характар музычнай мовы (2 гадзіны)

Характэрныя асаблівасці маршавай музычнай мовы. Вакальная і інструментальная музыка маршавага характару. Падкрэсліванне маршавага характару музыкі пры дапамозе рытмічнага акампанемента. Перадача маршавага характару музыкі з дапамогай кроку. Стварэнне рытмічнага акампанементу да твора маршавага характару.

Абагульняючы ўрок па тэме «Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Музыка Н.Сакалоўскага, словы М. Клімковіча і У. Карызны.

Беларуская народная песня-танец «Мікіта».

«Ай, ды школа». Музыка Д. Даўгалёва, словы У. Пецюкевіча.

«Дуб». Музыка А. Чыркуна, словы Я. Купалы.

«Лесной праздник». Музыка Ж. Металідзі, словы А. Фаткіна.

«Заўсёды ляці». Музыка Я. Глебава, словы П. Макаля.

«Песенка слоненка о самом себе». Музыка А. Даньшовай, словы А. Зарубіна.

«Салдаты маленькія». Музыка В. Кісценя, словы А. Каралёнак.

«Выйшоў бусел пагуляць». Музыка А. Даньшовай, словы А. Зарубіна.

В. Войцік. «Пад старым дубам».

Д. Лыбін. «Правінцыйная сімфонія», частка III (фрагмент).

Г. Пукст. Арыёза Марынкі (з оперы «Марынка»).

П. Чайкоўскі. Дуэт Машы і Прынца (з балета «Шчаўкунчык»); «Старадаўняя французская песенька» (са зборніка фартэпіянных п’ес «Дзіцячы альбом»).

Г. Гарэлава. «Папяровая балерына», «Кароль з каралевай».

М. Глінка. Сімфанічная ўверцюра «Арагонская хота»; «Паланэз» (з оперы «Іван Сусанін»).

Г. Вагнер. «Крокі».

В. Залётнеў. «Уступ», «Песенька Каваля» (з оперы «Адчыніце, казляняткі»), сл. П. Макаля.

Я. Глебаў. Першая інтэрмедыя (з араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства»).

Ф. Шапэн. Паланэз A-dur.

А. Дворжак. Славянскі танец № 8.

Ж. Б. Люлі. «Марш для турэцкай цырымоніі».

Віды і спосабы дзейнасці: выяўленне характэрных асаблівасцей песеннай, танцавальнай і маршавай музычнай мовы; фарміраванне пераліку прымет песеннасці, танцавальнасці, маршавасці; прымяненне пераліку прымет і інструментарыю для выяўлення характару музычнай мовы ў працэсе слухання; назіранне за развіццём музыкі; перадача малюнка мелодыі сродкамі графікі; разметка музычнай партытуры; выразнае выкананне твораў з улікам выяўленых рыс песеннасці, танцавальнасці, маршавасці; стварэнне мадэлі музычнага твора песеннага, танцавальнага, маршавага характару (калектыўна); сачыненне мелодыі песеннага, танцавальнага, маршавага характару (калектыўна).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):

пра характэрныя асаблівасці песеннай музычнай мовы;

характэрныя асаблівасці танцавальнай музычнай мовы;

характэрныя асаблівасці маршавай музычнай мовы;

інструментальную і вакальную музыку.

Умець (група прыватных уменняў):

выразна выконваць творы з улікам рыс песеннасці, танцавальнасці, маршавасці;

перадаваць песенны характар музычнай мовы пры дапамозе пластычнага інтанавання і выразных ліній;

перадаваць танцавальны характар музычнай мовы праз выразныя рухі і графічнае мадэляванне;

перадаваць маршавы характар музычнай мовы праз крок;

ствараць музычныя фрагменты песеннага, танцавальнага і маршавага характару;

эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнага вобраза;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара.

Умець (група ключавых уменняў):

выкарыстоўваць сродкі музычнага мастацтва для творчага самавыяўлення;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць змястоўную ацэнку вынікам вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:

у ходзе наведвання канцэртаў, культурна-масавых мерапрыемстваў;

у дамашнім музіцыраванні;

пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых (у тым ліку мультымедыйных) праектаў.

ІНТАНАЦЫЯ (8 гадзін)

Што такое інтанацыя (1 гадзіна)

Інтанацыйная аснова музыкі. Разнастайнасць інтанацый. Мадэляванне інтанацый сродкамі маўлення, музыкі, руху.

Блізкасць маўленчай і музычнай інтанацыі (1 гадзіна)

Удасканаленне ўменняў выразна выконваць літаратурныя і музычныя творы. Перадача жыццёвых з’яў пры дапамозе слова і гуку: выяўленне падабенства і адрознення.

«Зерне-інтанацыя» (1 гадзіна)

Характэрныя асаблівасці «зерня-інтанацыі». Вызначэнне «зерня-інтанацыі» музычнага фрагмента. Вызначэнне характару «зерня-інтанацыі». Выкананне «зерня-інтанацыі» на гукавысотных інструментах. Стварэнне «зерняў-інтанацый» рознага характару.

Выразная інтанацыя (1 гадзіна)

Вызначэнне інтанацый, якія перадаюць настрой, стан. Мадэляванне выразных інтанацый.

Выяўленчая інтанацыя (1 гадзіна)

Вызначэнне інтанацый, якія перадаюць з’явы навакольнай рэчаіснасці. Мадэляванне выяўленчых інтанацый.

Выразныя і выяўленчыя інтанацыі сустракаюцца ў адным музычным творы (2 гадзіны)

Поліінтанацыйны характар музычнай мовы. Спалучэнне выразных і выяўленчых інтанацый у музычных творах.

Абагульняючы ўрок па тэме «Інтанацыя» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

Беларускія народныя песні «Як пагнала бабуленька куранятак пасці», «Сеў жучок на сучок».

Швейцарская народная песня «Кукушка».

«В путь». Музыка Ф. Шуберта, словы В. Мюлера.

«Вяселая песенка», «Грустная песенка», «Тихая песенка», «Громкая песенка», «Медленная песенка», «Быстрая песенка». Музыка Г. Струвэ, словы В. Віктарава.

«Зима». Музыка Ц. Кюі, словы Я. Баратынскага.

«Навагодні карагод». Музыка І. Лучанка, словы В. Лучанок.

«Котенок и щенок». Музыка Т. Папаценка, словы В. Віктарава.

П. Чайкоўскі. «Няніна казка» (са зборніка фартэпіянных п’ес «Дзіцячы альбом»).

Я. Паплаўская. «Восеньскі малюнак».

Й. Гайдн. Сімфонія № 101 «Гадзіннік» (фрагмент ІІ часткі).

У. Кур’ян. «Гадзіннік».

А. Друкт. «Гарэзлівыя прыпеўкі».

Э. Тырманд. «Дзве сяброўкі».

М. Рымскі-Корсакаў. «Палёт чмяля» (з оперы «Казка пра цара Салтана»); тэма Астролага, арыя Шамаханскай царыцы (з оперы «Залаты пеўнік»).

Э. Грыг. «Песня Сольвейг» (з музыкі да драмы Г. Ібсена «Пер Гюнт»).

Л. К. Дакен. «Зязюля».

Б. Смятана. «Влтава» (з цыкла сімфанічнай паэмы «Мая Радзіма»).

В. Карэтнікаў. «У зімовым лесе», «Вальс вакол навагодняй ёлкі» (з сюіты «Поры года»).

Віды і спосабы дзейнасці: выразнае чытанне літаратурных тэкстаў, выкананне музычных твораў; выяўленне падабенства і адрозненняў у перадачы эмацыянальных станаў сродкамі маўленчай і музычнай інтанацыі; інсцэніроўка песні; выдзяленне «зерняў-інтанацый» з музычнай тканіны і вызначэнне іх характару; назіранне за развіццём мелодыі з «зерня-інтанацыі»; выяўленне выяўленчых і выразных інтанацый; параўнанне выяўленчых магчымасцей маўленчых і музычных інтанацый; выкананне «зерня-інтанацыі» на гукавысотных інструментах; выкананне выяўленчых інтанацый галасам і на гукавысотных інструментах; выразнае выкананне твораў з улікам выяўленых выяўленчых і выразных магчымасцей; стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша; стварэнне розных варыянтаў развіцця «зерня-інтанацыі»; мадэляванне выяўленчых інтанацый; падрыхтоўка даследчага ці мастацка-творчага праекта па тэме чвэрці.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):

пра інтанацыю;

блізкасць маўленчай і музычнай інтанацыі;

«зерне-інтанацыю»;

выразныя і выяўленчыя інтанацыі.

Умець (група прыватных уменняў):

мадэляваць інтанацыю;

вызначаць характар «зерня-інтанацыі»;

выконваць «зерні-інтанацыі» на гукавысотных інструментах;

самастойна ствараць «зерні-інтанацыі» рознага характару;

эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара.

Умець (група ключавых уменняў):

выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці для творчага самавыяўлення;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць змястоўную ацэнку вынікам вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:
у працэсе аналізу мастацкіх тэкстаў;
працэсе публічнага выканання мастацкіх тэкстаў;
дамашнім музіцыраванні;
пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых (у тым ліку мультымедыйных) праектаў.

РАЗВІЦЦЁ МУЗЫКІ (10 гадзін)

Як расказваюць і слухаюць музычныя гісторыі (1 гадзіна)

Развіццё музыкі (часавая прырода музычнага мастацтва). Спосабы развіцця музыкі. Роля сродкаў музычнай выразнасці ў развіцці музыкі.

Як развівае музыку кампазітар (1 гадзіна)

Спосабы развіцця музыкі, якія выкарыстоўваюцца кампазітарам. Магчымасці змены мелодыі, тэмпу, дынамікі, ладу, тэмбру, рэгістра гучання.

Развіццё мелодыі (1 гадзіна)

Выразныя магчымасці мелодыі. Назіранне за развіццём музычных інтанацый. Запіс мелодый.

Дынамічнае развіццё музыкі (1 гадзіна)

Павелічэнне і памяншэнне сілы гуку. Выкарыстанне сродкаў дынамічнага развіцця ў дзейнасці выканаўцы і кампазітара. Перадача дынамічнага развіцця музыкі з дапамогай колеравага, славеснага мадэлявання, пластычнага (амплітуда) інтанавання.

Тэмпавае развіццё музыкі (1 гадзіна)

Паскарэнне і запаволенне тэмпу. Выкарыстанне сродкаў тэмпавага развіцця ў дзейнасці кампазітара і выканаўцы. Перадача тэмпавага развіцця музыкі з дапамогай славеснага мадэлявання, руху.

Тэмбравае і рэгістравае развіццё музыкі (1 гадзіна)

Выразныя магчымасці тэмбраў галасоў і інструментаў. Выразныя магчымасці змены рэгістраў. Выкарыстанне сродкаў тэмбравага і рэгістравага развіцця ў дзейнасці кампазітара. Перадача тэмбравага развіцця музыкі з дапамогай славеснага і колеравага мадэлявання. Перадача рэгістравага развіцця музыкі з дапамогай славеснага, графічнага мадэлявання.

Ладавае развіццё музыкі (1 гадзіна)

Выразныя магчымасці мажору і мінору. Выкарыстанне сродкаў ладавага развіцця ў творчасці кампазітара. Перадача ладавага развіцця музыкі з дапамогай славеснага і колеравага мадэлявання.

Майстэрства выканаўцаў (1 гадзіна)

Сродкі развіцця музыкі, якія выкарыстоўваюцца выканаўцам. Складанне выканальніцкага плана твора. Музычная імправізацыя.

Музычныя дыялогі (1 гадзіна)

Музычны дыялог. Выкананне музычнага пытання і адказу. Стварэнне музычнага дыялогу.

Абагульняючы ўрок па тэме «Развіццё музыкі» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

Беларуская народная песня «Сядзіць камар на дубочку».

«Снегопад». Музыка Ж. Металідзі, словы Э. Фарджон. Рускі тэкст М. Барадзіцкай.

«Почему медведь зимой спит». Музыка Л. Кніпера, словы А. Каваленкава.

«Песенка солнечных зайчиков». Музыка В. Казеніна, словы Ф. Лаўбэ.

«Как под мельницей». Музыка М. Андрэевай, словы народныя.

«Поезд». Музыка М. Мятлова, словы Т. Сікорскай.

«Медведь и комар». Музыка А. Прэсленева, словы В. Шуміліна.

«Улитка». Музыка В. Кікты, словы С. Сяровай.

«Самая лепшая». Музыка С. Хвашчынскага, словы У. Карызны.

«Родная бабуля». Музыка Д. Даўгалёва, словы У. Пецюкевіча.

«Волшебный оркестр». Музыка Д. Даўгалёва, словы В. Паліканінай.

«Тень-тень, потетень». Музыка В. Калліннікава, словы народныя.

«Сороконожки». Музыка А. Даньшовай, словы У. Арлова.

Іранская народная песня «Дождь».

В. Карэтнікаў. «Снежнае мястэчка» (з сюіты «Поры года»).

Г. Гарэлава. «Варона на слізкім даху».

Я. Глебаў. Фантазія на тэму беларускай народнай песні «Перапёлачка».

Э. Грыг. «Раніца», «У пячоры горнага караля» (з сюіты «Пер Гюнт»). «Вясельны дзень у Трольхаўгене».

Ф. Шуберт. Вальс сі мінор.

А. Вівальдзі. «Бура на моры», Канцэрт для скрыпкі з аркестрам «Зіма» (частка 1) (з цыкла «Поры года»).

Віды і спосабы дзейнасці: назіранне за развіццём музыкі; выяўленне сродкаў выразнасці, выкарыстаных кампазітарам для стварэння і развіцця музычнага вобраза; назіранне за развіццём мелодыі; адлюстраванне рытмічнага і гукавышыннага змяненняў мелодыі з дапамогай выразных рухаў рук; перадача гукавысотнага развіцця мелодыі сродкамі графікі ці пластычнага інтанавання; назіранне за дынамічным развіццём музыкі, адлюстраванне дынамічных змен праз адценні колеру; выяўленне тэмпавага развіцця музыкі, перадача яго з дапамогай руху; назіранне за ладавымі змяненнямі ў музыцы, перадача ладавых змяненняў з дапамогай картак-смайлікаў; выразнае выкананне твораў з улікам выяўленых змяненняў; выяўленне музычнага дыялогу (пытанняў і адказаў); выразнае выкананне песні ў рэжыме дыялогу; складанне выканальніцкага плана песні з указаннем сродкаў выканальніцкага развіцця; стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша; развіццё мелодыі з дапамогай змены вышыні гукаў і рытмічнага малюнка; сачыненне музычнага дыялогу або яго частак (пытанне, адказ); падрыхтоўка даследчага ці мастацка-творчага праекта па тэме чвэрці.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):

пра спосабы развіцця музыкі;

сродкі музычнай выразнасці, якія выкарыстоўваюцца кампазітарам і выканаўцам для развіцця музыкі;

тэмпавае, дынамічнае, ладавае, рэгістравае, тэмбравае развіццё музыкі;

музычны дыялог, яго будову.

Умець (група прыватных уменняў):

сачыць за развіццём мелодыі і перадаваць яго пры дапамозе лініі;

выконваць рытмічны малюнак, запісаны з дапамогай сімвалаў або працягласцей;

сачыць за дынамічным, тэмпавым, ладавым, рэгістравым, тэмбравым развіццём музыкі і перадаваць (адлюстроўваць) яго з дапамогай славеснага, колеравага, графічнага, пластычнага і прасторавага мадэлявання;

імправізаваць (развіваць мелодыю);

ствараць выканальніцкі план твора;

выкарыстоўваць тэмпавае, дынамічнае, ладавае, рэгістравае, тэмбравае развіццё музыкі ва ўласнай творчай дзейнасці;

выконваць і ствараць музычныя дыялогі;

эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара.

Умець (група ключавых уменняў):

выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці для творчага самавыяўлення;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць змястоўную ацэнку вынікам вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:

у працэсе аналізу мовы мастацкіх тэкстаў;

пры распрацоўцы плана выканання мастацкіх твораў;

пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых (у тым ліку мультымедыйных) праектаў.

## БУДОВА (ФОРМЫ) МУЗЫКІ (9 гадзін)

### Разнастайнасць будовы музычных твораў (1 гадзіна)

Будова (формы) музычных твораў. Разнастайнасць музычных форм.

### Кантрасты і паўторы ў жыцці і музыцы (2 гадзіны)

Кантрасты і паўторы як аснова будовы музычных твораў. Узаемасувязь зместу і будовы музычных твораў. Элементы музычнай мовы. Фраза. Сказ. Вызначэнне музычных фраз на слых і па нотным запісе. Дыханне па фразах пры выкананні вакальных твораў.

### Як музыка расказвае гісторыі, у якіх няма кантрастаў (1 гадзіна)

Музычныя творы, у якіх няма кантрастаў. Кульмінацыя як вяршыня развіцця музыкі. Вызначэнне кульмінацыі на слых і па нотным запісе.

### Двухчасткавая форма (1 гадзіна)

Чаргаванне кантрастаў і паўтораў у музычнай форме. Двухчасткавая кантрасная форма. Перадача (адлюстраванне) двухчасткавай кантраснай формы пры дапамозе сімвалаў (іншых сродкаў). Запеў, прыпеў, куплет. Выкананне вакальнага твора ў двухчасткавай кантраснай форме. Канструяванне музычных фрагментаў у двухчасткавай форме.

### Трохчасткавая рэпрызная форма (1 гадзіна)

Рэпрыза як паўтор часткі музычнага твора. Перадача (адлюстраванне) трохчасткавай рэпрызнай формы пры дапамозе сімвалаў (іншых сродкаў). Слуханне і выкананне музычных твораў у трохчасткавай рэпрызнай форме. Канструяванне музычных фрагментаў у трохчасткавай форме.

### Ронда (1 гадзіна)

Рэфрэн, эпізод. Адлюстраванне формы ронда пры дапамозе сімвалаў (іншых сродкаў). Слуханне і выкананне музычных твораў у форме ронда.

### Варыяцыі (1 гадзіна)

Змяненне музыкі. Тэма, варыяцыі. Вызначэнне тэмы і варыяцый пры праслухоўванні музычнага твора.

Абагульняючы ўрок па тэме «Будова (формы) музыкі» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

Беларускі народны танец «Карагодны».

Беларускія народныя песні «А мы грушу пасадзілі», «Пад калінаю, пад малінаю», «На лузе, на лузе зелянёшанькім».

Беларуская народная песня «Кума мая, кумачка» ў апрацоўцы В. Сярых.

Руская народная танцавальная песня «Камаринская».

«Прятки». Музыка А. Думчанкі, словы А. Кушнера.

«Доброта». Музыка І. Лучанка, словы Н. Тулупавай.

«Веселые медвежатки». Музыка А. Паплянавай, словы Н. Пікулевай.

«Болтунья». Музыка С. Пракоф’ева, словы А. Барто.

«Зачем нам выстроили дом?». Музыка Д. Кабалеўскага, словы В. Віктарава.

А. Літвіноўскі. «Вячэрнія аблокі».

П. Чайкоўскі. «Італьянская песенька», «Баба Яга», «Камарынская» (са зборніка фартэпіянных п’ес «Дзіцячы альбом»).

М. Глінка. Сімфанічная уверцюра «Камарынская».

Ф. Шапэн. Прэлюдыя № 7.

Э. Грыг. «Танец Анітры» (з музыкі да драмы Г. Ібсена «Пер Гюнт»).

Віды і спосабы дзейнасці: выяўленне кантрасных сродкаў музычнай выразнасці; вызначэнне элементаў музычнай мовы (фраза, сказ), вызначэнне кульмінацыі; вызначэнне будовы твораў (адначасткавых, двухчасткавых, трохчасткавых, у форме ронда, у форме варыяцый) у працэсе слухання; адлюстраванне будовы твораў з дапамогай геаметрычных фігур; выяўленне частак твора, якія паўтараюцца, (рэфрэн) і новых (эпізоды) частак твора, што маюць форму ронда; падбор выканальніцкіх сродкаў для падкрэслівання кантрастаў; выразнае выкананне твораў; стварэнне выканальніцкага плана твора з выкарыстаннем кантрасных элементаў; стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове літаратурнага тэксту; складанне двух-, трохчасткавых кампазіцый, кампазіцый у форме ронда з загадзя прыгатаваных музычных фрагментаў; вар’іраванне мелодыі; падрыхтоўка даследчага ці мастацка-творчага праекта па тэме чвэрці.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):

пра ўзаемасувязі зместу і формы музычнага твора;

кантрасты і паўторы у жыцці і ў музыцы;

элементы музычнай гаворкі (фраза, сказ; кульмінацыя);

музычныя формы (двухчасткавая, трохчасткавая, варыяцыі, ронда).

Умець (група прыватных уменняў):

вызначаць асобныя элементы музычнай мовы (фразы) на слых і па нотным запісе;

вызначаць будову музычных твораў і адлюстроўваць яе пры дапамозе сімвалаў ці іншых сродкаў;

выконваць творы ў двухчасткавай кантраснай, трохчасткавай рэпрызнай формах, форме ронда;

канструяваць творы ў двухчасткавай кантраснай, трохчасткавай рэпрызнай формах, форме ронда;

эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара.

Умець (група ключавых уменняў):
выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці для творчага самавыяўлення;
удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;
даваць змястоўную ацэнку вынікам вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:
пры аналізе мастацкіх тэкстаў;
у самастойнай творчай дзейнасці;
пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых (у тым ліку мультымедыйных) праектаў.

## ГЛАВА 5
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў IV КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

(1 гадзіна ў тыдзень, усяго 35 гадзін)

### МУЗЫЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ (16 гадзін)

#### Музыка – люстэрка жыцця і душа народа (1 гадзіна)

Адлюстраванне ў музыцы гістарычных падзей, жыццёвага ўкладу беларусаў, рыс нацыянальнага характару. Народная і прафесійная музыка. Музыка ў жыцці сучаснага чалавека. Пазыўныя беларускага радыё.

#### Нараджэнне і жыццё беларускай песні (2 гадзіны)

Жыццёвы змест і жанравая разнастайнасць беларускіх народных песень. Адлюстраванне розных бакоў жыцця беларускага народа ў працоўных, каляндарна-абрадавых, жартоўных песнях і калыханках. Нараджэнне народнай песні. Імправізацыя. Перадача жыццёвага вопыту ад пакалення да пакалення праз народную песню. Варыянтнасць, пераменны лад і памер як характэрныя асаблівасці народнай песні. Народная манера выканання (падгалосак, падводка, утора).

#### Восеньскія песні (1 гадзіна)

Перадача ў песні стану восеньскай прыроды. Імітацыя працоўных працэсаў, характэрных для пары збору ўраджаю. Вобразы восеньскай прыроды ў музыцы беларускіх кампазітараў.

#### Музыка ў казках беларускага народа (1 гадзіна)

Пераўтваральная сіла музычнага мастацтва, адлюстраваная ў беларускіх народных казках. Народныя інструменты, музыканты-выканаўцы ў казках беларускага народа. «Гучанне музыкі» ў казцы. Казачныя вобразы ў творчасці беларускіх кампазітараў.

#### Музыка ў гульнях беларускага народа (1 гадзіна)

Гульні ў жыцці беларускага народа. Перадача жыццёвага вопыту ад пакалення да пакалення праз гульню. Гульні ў народных абрадах і святах. Асаблівасці правядзення гульняў у зімовы, летні, восеньскі перыяды. Роля музыкі ў беларускіх народных гульнях. Уменне арганізаваць гульню і ўдзельнічаць у ёй.

#### Беларускія музычныя інструменты (2 гадзіны)

Роля народных інструментаў у жыцці беларускага народа. Разнастайнасць беларускіх народных інструментаў. Знешні выгляд, тэмбравыя характарыстыкі інструментаў, спосабы ігры на іх. Склад традыцыйных ансамбляў народнай музыкі. Творы беларускіх кампазітараў для народных інструментаў. Народныя інструменты ў жыцці сучаснага беларуса.

Танцавальная культура майго народа (2 гадзіны)

Жанравая разнастайнасць беларускіх народных танцаў. Песні-танцы. Характэрныя малюнкі і асноўныя хады беларускіх танцаў. Беларускія народныя танцы ў творчасці беларускіх кампазітараў.

Музыка расказвае пра мінулае нашай Радзімы (3 гадзіны)

Гісторыя беларускага народа ў народнай музыцы і творах прафесійных кампазітараў. Творчасць Я. Д. Галанда, М. Радзівіла, М. К. Агінскага. Песні Вялікай Айчыннай вайны. Творы сучасных беларускіх аўтараў, прысвечаныя гістарычным падзеям.

Музыка ў народных абрадах і святах (Каляды) (2 гадзіны)

Святы зімовага каляндарна-абрадавага цыкла ў жыцці нашых продкаў. Традыцыі святкавання Каляд у жыцці сучасных беларусаў. Творы беларускіх кампазітараў, якія адлюстроўваюць традыцыі калядавання.

Абагульняючы ўрок па тэме «Музычная культура Беларусі» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Музыка Н. Сакалоўскага, словы М. Клімковіча і У. Карызны.

Беларускія народныя песні «Частуйцеся, госці», «Чаму ж мне не пець», «А ў нашага пана дажыначкі рана», «Ой, мамачка, восень», «Ой, там у бару сасна шумела», «Чаго ты, лося, чаго ты, дзікі», «На Дунаёчку», «У нас сягоння дажыначкі», «Вецярок вее, жыта палавее», «Ярная», «Дубровушка ды зялёная», «Бачыць маё вочка, што край недалёчка», «Ох, і сеяла Ульяніца лянок», «Як паставіў верабейка на сметнічку хату», «Зайграй жа мне, дударачку», «Шчодры вечар», «Шчодрык-Петрык», «Ой, калядачкі, вы вярніцеся», «Прыехала Каляда ўвечары», «А ў заінькі тры думухны» , «Го-го-го, каза», «На нова лета», «Ой, рана-рана куры запелі», «Бегла Калядка пешкам-пешкам», «Спі, сыночак міленькі».

Папеўкі «А мы грушу пасадзілі», «У мядзведзя на бару», «Журавель».

Найгрышы «Восень», «Казачок», «Цярэшка», «Кадрыля», «Шастак», «Кракавяк».

Беларускія народныя танцы «Юрачка», «Мікіта», «Янка-полька», «Крыжачок», «Бульба-полька».

«Радзіма мая дарагая». Музыка У. Алоўнікава, словы А. Бачылы.

«Наша Радзіма». Музыка А. Безенсон, словы Л. Глінскай.

«Завешся ты ласкава Белай Руссю». Музыка Л. Захлеўнага, словы В. Лучанок.

«Бацькаўская зямля». Музыка А. Чыркуна, словы Н. Загорскай.

«Манумент». Музыка А. Чыркуна, словы А. Дзеружынскага.

«Учителям». Музыка В. Кісценя, словы М. Пляцкоўскага.

«Адлёт жураўлёў». Музыка народная, словы Я. Коласа.

«Журавінка». Музыка М. Літвіна, словы І. Цітаўца.

«Песенька сяброў» з мюзікла «Прыгоды ў замку Алфавіт». Музыка В. Войціка, словы С. Клімковіч.

«Калабок». Музыка А. Чыркуна, словы І. Цітаўца.

«Мы помним радость сорок пятого». Музыка Э. Зарыцкага, словы М. Ясеня.

Прывітанне Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча (на аснове вясельнай народнай песні «Частуйцеся, госці»). Музыка Н. Сіроты, словы У. Карызны.

«Мірскі замак». Музыка В. Кісценя, словы І. Цітаўца.

«Пришла зима с морозами». Музыка В. Войціка, словы В. Высотскай.

«Што прыносіць Новы год?». Музыка А. Безенсон, словы Л. Дайнекі.

«Жураўлі на Палессе ляцяць». Музыка І. Лучанка, словы А. Ставера.

«Явар і каліна». Музыка Ю. Семяняка, словы Я. Купалы.

«Лясная песня». Музыка У. Алоўнікава, словы А. Русака.

«Поклонитесь, внуки, деду». Музыка І. Лучанка, словы М. Ясеня.

І. Жыновіч. «Беларускія танцы».

М. Чуркін. Сімфаньета «Беларускія карцінкі» (фрагмент па выбары), «Беларуская калыханка».

В. Кузняцоў. Вітаўт-сюіта (фрагмент па выбары).

В. Карэтнікаў. «Адлятаюць птушкі» (з сюіты «Поры года»).

В. Войцік. «Калядоўшчыкі» (з сімфанічнай сюіты «Забавы»).

Д. Лыбін. «Неўрачысты выхад праз негалоўную браму» (з цыкла «Музыка для горада Нясвіжа»).

«Астрамечаўскі рукапіс», вядомы пад назвай «Полацкі сшытак» (фрагменты па выбары педагагічнага работніка).

Я. Д. Голанд. Арыя Агаткі з оперы «Агатка, альбо Прыезд пана».

М. К. Агінскі. Паланэзы ля мінор, Фа мажор.

М. Радзівіл. Паланэз № 1 «Паляванне».

Я. Глебаў. Тарантэла (з балета «Альпійская балада»).

Духоўныя канты «Нова радость стала», «Скиния златая», «Дар ныне пребогатый» у апрацоўцы Л. Шлег.

У. Алоўнікаў. Сімфанічная паэма «Партызанская быль».

А. Багатыроў. Арыя Апанаса (з оперы «У пушчах Палесся»).

Віды і спосабы дзейнасці: выяўленне жыццёвага зместу музыкі; развучванне і выразнае выкананне беларускіх песень, твораў беларускіх кампазітараў; вызначэнне на слых і характарыстыка беларускіх народных інструментаў, мелодый беларускіх песень і танцаў; інструментоўка музычных фрагментаў; імітацыя рухаў, уласцівых розным відам працоўнай дзейнасці, у працэсе выканання працоўных песень; інсцэніроўка песень; выкананне асноўных хадоў беларускіх танцаў (на выбар педагагічнага работніка); падрыхтоўка даследчага ці мастацка-творчага праекта па тэме паўгоддзя.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):

пра характэрныя асаблівасці музыкі беларускага народа;

музыку народную і кампазітарскую;

адлюстраванне гісторыі і жыцця беларускага народа ў народнай музыцы і творах прафесійных кампазітараў;

каляндарна-абрадавы цыкл;

характэрныя асаблівасці народнай музыкі (варыянтнасць, пераменны лад і памер);

народную выканальніцкую манеру;

ролю музыкі ў беларускіх народных казках і гульнях;

беларускія народныя інструменты (знешні выгляд, тэмбравыя характарыстыкі, традыцыі выкарыстання);

беларускія народныя танцы (жанравая разнастайнасць, асноўныя малюнкі і хады; традыцыі выканання), песні-танцы;

гарадскую танцавальную культуру.

Умець (група прыватных уменняў):

слухаць і выконваць песні каляндарна-абрадавага цыкла;

характарызаваць тэмбры беларускіх народных інструментаў;

выкарыстоўваць асобныя народныя інструменты пры выкананні і сачыненні;

прымаць удзел у народных святах (выконваць песні, удзельнічаць у гульнях);

вызначаць на слых мелодыі беларускіх народных танцаў, характарызаваць рознымі спосабамі іх малюнкі, выконваць асноўныя хады; самастойна ствараць простыя кампазіцыі;

эмацыянальна адклікацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара.

Умець (група ключавых уменняў):

выкарыстоўваць сродкі музычнага мастацтва для творчага самавыяўлення;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць змястоўную ацэнку вынікам вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:

у ходзе ўдзелу ў народных святах;

у сямейным, аматарскім музіцыраванні;

пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых (у тым ліку мультымедыйных) праектаў, прысвечаных культуры Беларусі.

МУЗЫЧНЫЯ ПАДАРОЖЖЫ (19 гадзін)

Музыка – мова сяброўства і ўзаемаразумення паміж народамі (1 гадзіна)

Музыка – мова, якая не патрабуе перакладу. Сродкі музычнай камунікацыі і асаблівасці іх выкарыстання. Асэнсаванне назапашанага вопыту слухання, выканання, стварэння музычных твораў. Роля музыкі ва ўсталяванні ўзаемаразумення паміж народамі, фарміраванні паважлівых адносін да іншых культур.

Музыка нашых суседзяў – рускага, украінскага, польскага, прыбалтыйскіх народаў (4 гадзіны)

Характэрныя асаблівасці музыкі рускага, украінскага, польскага, прыбалтыйскіх народаў. Наяўнасць падобных рыс у музыцы славянскіх народаў. Наяўнасць падобных рыс, традыцый існавання музычнага мастацтва ў краінах-суседках. Вызначэнне падабенства і адрознення ў народнай і прафесійнай музыцы беларускага, рускага, украінскага, польскага, прыбалтыйскіх народаў. Выразнае выкананне музыкі рускага, украінскага, польскага, прыбалтыйскіх народаў.

Музыка ў народных абрадах і святах (Масленіца, Гуканне вясны, Саракі) (1 гадзіна)

Святы вясновага каляндарна-абрадавага цыкла ў жыцці нашых продкаў. Масленіца, Гуканне вясны, Саракі ў жыцці сучасных беларусаў. Традыцыі ўдзелу ў святах. Творы беларускіх кампазітараў, што адлюстроўваюць традыцыі свят вясновага каляндарна-абрадавага цыкла.

Музычнае падарожжа па Еўропе (4 гадзіны)

Музычная культура Еўропы (музычная культура дзвюх краін на выбар або агляд). Традыцыі еўрапейскай музычнай культуры. Творчасць І. С. Баха; кампазітары венскай класічнай школы: Й. Гайдн, В. А. Моцарт, Л. ван Бетховен; музычная культура Італіі: скрыпічныя майстры Амаці і Гварнеры, творчасць Н. Паганіні, Дж. Вердзі; музычная культура Нарвегіі: творчасць Э. Грыга. Уклад еўрапейскай музычнай культуры ў сусветную музычную культуру. Асэнсаванне вопыту выканання твораў кампазітараў-класікаў.

Мудрагелістыя інтанацыі ўсходняй музыкі (2 гадзіны)

Музычная культура Японіі і Кітая. Асаблівасці музычнай мовы. Пентатоніка. Народныя інструменты. Выразнае выкананне вакальных і інструментальных твораў. Творы беларускіх аўтараў, якія перадаюць уражанні ад наведвання краін Усходу.

Узоры афрыканскіх рытмаў (2 гадзіны)

Характэрныя асаблівасці музыкі народаў Афрыкі. Вядучая роля рытму. Народныя інструменты. Асаблівасці выканальніцкай манеры. Выразнае выкананне характэрных

рытмаў музыкі народаў Афрыкі. Творы прафесійных кампазітараў, у якіх выкарыстаны рытмы, уласцівыя музыцы народаў Афрыкі.

Музыка Амерыкі (2 гадзіны)

Жанравая разнастайнасць музычнай культуры Амерыкі. Вытокі ўзнікнення джаза. Характэрныя асаблівасці джазавай музыкі. Музыка прафесійных кампазітараў, якая перадае характэрныя асаблівасці джаза. Творчасць Дж. Гершвіна.

Музыка народаў, якія насяляюць Рэспубліку Беларусь (1 гадзіна)

Музычная культура народаў, якія насяляюць Рэспубліку Беларусь, як частка беларускай музычнай культуры (рамачны змест). Характэрныя асаблівасці музыкі нацыянальнай супольнасці (на выбар). Культурныя традыцыі нацыянальнай супольнасці. Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур.

Музыка ў народных абрадах і святах (Купалле) (1 гадзіна)

Святы летняга каляндарна-абрадавага цыкла ў жыцці нашых продкаў. Купалле ў жыцці сучасных беларусаў. Творы беларускіх кампазітараў, што адлюстроўваюць традыцыі святкавання Купалля.

Абагульняючы ўрок па тэме «Музычныя падарожжы» (1 гадзіна)

Прыкладны музычны матэрыял

Беларускія народныя песні: «А сёння ў нас Масленка», «На вуліцы Масленіца», «А на гарэ сонца», «На вуліцы дзеўкі гулялі», «Ды была ў бабкі курка рабенька», «Агу, вясна, агу, красна», «Песенька мая харошая», «Ой, вясна, вясна, вясеначка», «Ой, вясна, ой, вясна», «Гаспадарочак, слаўны паночак», «Жавароначкі, прыляціце», «Ой, праляталі ды два галубочкі», «У нас сёння Купалачка», «На святога Яна дзеўкі зелле рвалі», «Шла Купалка па вуліцы», «Цяпер Купала, а заўтра Ян», «Ой, рана на Йвана».

Рускія народныя песні: «Вниз по матушке, по Волге», «В сыром бору тропина».

Украінскія народныя песні: «Щедрик», «Реве та стогне Дніпр широкий».

Літоўская народная песня «Солнышко вставало».

Латышская народная песня «Вей, вей, ветерок». Апрацоўка А. Юр’яна, рускі тэкст К. Алямасавай.

Польская народная песня «Висла».

Французская народная песня «В Авиньоне на мосту».

Італьянская народная песня «О мое солнце».

Традыцыйная афрыканская песня «Сияхамба».

Афрыканская дзіцячая народная песня «Ветер лагуны». Рускі тэкст В. Сібірскага.

Святочныя цырыманіяльныя танцы ў кенійскай вёсцы.

Традыцыйны польскі танец «Мазурка».

Вясновыя навальніцы. Традыцыйная кітайская музыка.

Японская народная песня «Сакура».

«Купалінка». Музыка У. Тэраўскага, словы М. Чарота.

«Родны край». Музыка А. Безенсон, словы І. Ціўновіч.

«Песня пра Нёман». Музыка Н. Сакалоўскага, словы А. Астрэйкі.

«Моя Россия». Музыка Г. Струвэ, словы Н. Салаўёвай.

«Бьют тамтамы». Музыка Г. Струвэ, словы А. Барто.

«Джаз». Музыка Я. Дубравіна, словы В. Суслава.

«Родные просторы». Каўбойская песня. Рускі тэкст Ю. Хазанава.

«Птицы над взморьем». Музыка Харада Рэтара, словы Кагэсіма Тарыякі.

«Заход солнца». Музыка Э. Грыга, словы А. Мунка, пераклад С. Свірыдзенка.

«Мы ідзём гукаць вясну». Музыка В. Сярых, словы І. Цітаўца.

«Мамін голас». Музыка В. Сярых, словы М. Людкевіч.

«Музыка» – наш ссусвет». Музыка А. Атрашкевіч, словы Б. Макарэвіча.

Дж. Расіні. Неапалітанская тарантэла.

Н. Сакалоўскі. «Мазурка».

Д. Лыбін. «Джаз, які заблудзіўся».

С. Бельцюкоў. «Гарадскі пейзаж». «Вечар» (з сюіты «Кітайскія акварэлі» для ўдарных інструментаў).

М. Глінка. Хор «Славься» (з оперы «Іван Сусанін»).

Спірычуэл. «Глыбокая рака».

Дж. Гершвін. «Калыханка Клары» (з оперы «Поргі і Бес»), «Рапсодыя ў блюзавых танах».

Н. Паганіні. «Кампанэла».

Н. Паганіні – Ф. Ліст. «Кампанэла».

В. А. Моцарт. Сімфонія № 40 (экспазіцыя, I частка), «Ронда ў турэцкім стылі», опера «Чароўная флейта» (фрагменты па выбары педагагічнага работніка).

А. Вівальдзі. «Поры года» (на выбар педагагічнага работніка).

М. К.Чурлёніс. Сімфанічная паэма «У лесе» (фрагмент).

С. Рахманінаў. Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам № 3 (частка I, галоўная партыя).

Г. Свірыдаў. «Зімовая дарога» (з музычных ілюстрацый да аповесці А. С. Пушкіна «Мяцеліца»).

Ф. Шапэн. Накцюрны E-dur, cis-moll. Мазурка № 47 (a-moll).

І. Штраўс. «Марш Радзецкага», «Полька-піцыката».

А. Туранкоў. «Ой, рана на Йвана» (з оперы «Кветка шчасця»).

Віды і спосабы дзейнасці: выяўленне жыццёвага зместу музыкі розных народаў; развучванне і выразнае выкананне песень, інструментальных, танцавальных кампазіцый, якія адносяцца да музычных культур іншых народаў (на выбар педагагічнага работніка); выяўленне падабенства і адрозненняў у музыцы розных народаў; слуханне і аналіз твораў беларускіх кампазітараў, у якіх выкарыстаны характэрныя асаблівасці музыкі іншых народаў; выяўленне характэрных асаблівасцей музычнай культуры народаў, якія насяляюць Рэспубліку Беларусь; азнаямленне з песнямі вясновага і летняга каляндарных цыклаў; падрыхтоўка даследчага або мастацка-творчага праекта па тэме паўгоддзя.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць (мець уяўленні):

пра камунікатыўную прыроду музычнага мастацтва;

разнастайнасць музычных культур, іх узаемадзеянне, дыялог культур;

характэрныя асаблівасці музыкі рускага, украінскага, польскага, прыбалтыйскіх народаў;

характэрныя асаблівасці музыкі народаў Еўропы, Азіі, Афрыкі, Амерыкі;

характэрныя асаблівасці музыкі народаў, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

Умець (група прыватных уменняў):

эмацыянальна адклікацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

выяўляць падабенства зместу і адрознення ў выразных сродках музыкі розных народаў;

разумець змест і выразна выконваць музыку розных народаў;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара.

Умець (група ключавых уменняў):

паважліва ставіцца да праяўленняў іншых культур;

выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці для творчага самавыяўлення;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць змястоўную ацэнку вынікам вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:

пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых (у тым ліку мультымедыйных) праектаў;

у ходзе ўдзелу ў народных святах (Масленіца, Гуканне вясны, Саракі, Купалле);

у сямейным, аматарскім музіцыраванні.